САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ: ШТО ГАРАНТУЕ ДЗЯРЖАВА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Добры дзень! Мяне завуць Вольга Мышкіна, жыву ў Мінску. Наша суседка з верхняга паверха — адзінокая старая, ледзь ходзіць. Бачу, што нават дарога ў краму даецца ёй няпроста. Дапамагаем ёй, але ўвесь час гэта рабіць няма магчымасці — мы маладыя, любім падарожнічаць, часта выязджаем. Як яшчэ можна ёй дапамагчы, куды звярнуцца?

— Вашай суседцы трэба звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва па месцы жыхарства па аказанне сацыяльных паслуг. Вы ў якім раёне Мінска жывяце?

— У Чыжоўцы.

— Гэта Заводскі раён... Значыць, трэба звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр Заводскага раёна горада Мінска. У мэтах прадастаўлення разнастайных сацыяльных паслуг грамадзянам пажылога ўзросту і інвалідам у структуры тэрытарыяльных цэнтраў створаны спецыялізаваныя аддзяленні, уключаючы і аддзяленні сацыяльнай дапамогі на даму, якія аказваюць паслугі па куплі і дастаўцы на дом прадуктаў харчавання, дастаўцы лекаў, прыбіранні жылых памяшканняў і інш.

— Гэта платныя паслугі?

— Так, але яны аказваюцца па сацыяльна нізкіх тарыфах. Тарыф за гадзіну на такія паслугі ў Мінску — 48 капеек (старымі грашыма — 4750 руб.). А калі бабуля, акрамя ўсяго, яшчэ адзінокая і ў яе невялікі памер пенсіі (не перавышае двух бюджэтаў пражыткова-га мінімуму, на сёння гэта 351 руб.), то яна будзе абслугоўвацца на ўмовах частковай аплаты, якая складае 60% ад тарыфу на сацыяльныя паслугі.

Аказанне сацыяльных паслуг на даму ажыццяўляецца на падставе пісьмовай заявы і дагавора аказання сацыяльных паслуг, складзенага паміж грамадзянінам (яго законным прадстаўніком), з аднаго боку, і тэрытарыяльным цэнтрам, з другога боку, пры наяўнасці ў грамадзяніна медыцынскіх паказанняў і (або) адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў для аказання сацыяльных паслуг, пацверджаных медыцынскай даведкай аб стане здароўя.

— Турбуе вас Аляксандра Герасімовіч са Слуцка. Мяне цікавіць такое пытанне: калі пажылы чалавек знаходзіцца ў доме-інтэрнаце для састарэлых на дзяржаўным забеспячэнні, колькі пенсіі ён будзе атрымліваць на рукі?

— Асобам, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дамах-інтэрнатах, пенсія выплачваецца з улікам кошту ўтрымання ў доме-інтэрнаце. Калі пажылы чалавек знаходзіцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні, яму гарантуецца выплата 10% назначанай пенсіі, але не менш за 20% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. У выпадку, калі памер пенсіі перавышае кошт утрымання, выплачваецца розніца паміж пенсіяй і коштам утрымання, але не менш вышэй названай гарантыі. Гэтая норма прапісана ў артыкуле 84 Закона «Аб пенсійным забеспячэнні».

— Мяне завуць Аксана Юрчанка, я з Баранавіч вам тэлефаную. Калі ласка, адкажыце, што трэба для таго, каб майго бацьку ўзялі на сацыяльнае абслугоўванне на даму? Яму 72 гады, жыве ў г.п. Гарадзішча Баранавіцкага раёна.

— Для заключэння дагавора аказання сацыяльных паслуг вашаму бацьку неабходна звярнуцца ў тэрытарыяльны цэнтр па месцы жыхарства і прад'явіць дакумент, які сведчыць асобу, дакументы аб праве на льготы (калі ён карыстаецца якімі-небудзь ільготамі), а таксама медыцынскую даведку аб стане здароўя, якая змяшчае інфармацыю аб наяўнасці медыцынскіх паказанняў і (або) адсутнасці медыцынскіх супрацьпаказанняў для аказання сацыяльных паслуг у форме сацыяльнага абслугоўвання на даму.

Работнікі цэнтра на працягу трох рабочых дзён правядуць абследаванне матэрыяльна-бытавога становішча вашага бацькі, складуць акт абследавання і зробяць запыт дакументаў, прадугледжаных заканадаўствам, калі яны адсутнічаюць.

Рашэнне аб заключэнні дагавора аказання сацыяльных паслуг прымаецца кіраўніком тэрытарыяльнага цэнтра на працягу пяці рабочых дзён пасля атрымання апошняга неабходнага для аказання сацыяльных паслуг дакумента.

— Дзякуй вялікі за адказ. У мяне яшчэ пытанне: колькі будуць каштаваць сацыяльныя паслугі?

— Гэта залежыць ад матэрыяльнага становішча і складу сям'і непрацаздольнага грамадзяніна. Цалкам бясплатна сацыяльныя паслугі на даму аказваюцца адзінокім непрацаздольным грамадзянам, сярэднедушавы даход якіх не перавышае зацверджанага ва ўстаноўленым парадку бюджэту пражыткова-га мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ), гэта значыць175 рублёў 50 капеек. На ўмовах частковай аплаты (60% тарыфу на сацыяльныя паслугі) — адзінокім непрацаздольным грамадзянам, сярэднедушавы даход якіх не перавышае 200% БПМ (351 рубель).

Для таго каб забяспечыць даступнасць сацыяльнага абслугоўвання, Брэсцкі аблвыканкам устанавіў гадзінны тарыф на гарантаваныя дзяржавай сацыяльныя паслугі ў памеры 40 капеек (4000 рублёў на старыя грошы).

— Ірына Сцяпанаўна вас турбуе, жыву ў Брэсцкай вобласці. А пытанне ў мяне такое: да каго можа прыходзіць сацработнік, а да каго не? Чула, што да алкаголікаў не прыходзяць, гэта праўда? А калі пажылы чалавек выпівае, але на ўліку ў нарколага не знаходзіцца?

— Ірына Сцяпанаўна, наяўнасць у грамадзяніна стану алкагольнага ап'янення, а таксама паводзіны, якія парушаюць агульнапрынятыя нормы і правілы, прыніжаюць і абражаюць чалавечую годнасць работнікаў тэрытарыяльных цэнтраў, а таксама стан, які ўяўляе пагрозу для іншых грамадзян і самога грамадзяніна, з'яўляюцца падставай для адмовы ў заключэнні дагавора аказання сацыяльных паслуг, у аказанні сацыяльных паслуг, а таксама для скасавання заключанага раней дагавора.

— Леанід Ерафеевіч Каласкоў, Быхаўскі р-н (пытанне зададзена напярэдадні «прамой лініі»). 30 ліпеня я прачытаў у «Звяздзе», што мінімальныя працоўныя пенсіі павялічваюцца на 3,3%. Гэта ўсё пенсіі павялічаныя або толькі мінімальныя працоўныя? І яшчэ адно пытанне: у 75 гадоў да пенсіі выплачваюць дабаўку 33 рублі, а ў 80 гадоў — 44 рублі. Гэта кожны месяц будуць яе выплачваць? Мне споўнілася 80 гадоў, але я не атрымаў ніякай дабаўкі.

— З 1 жніўня гэтага года ў сувязі з павелічэннем бюджэту пражыткова-га мінімуму пераразлічаны мінімальныя працоўныя пенсіі, сацыяльныя пенсіі, надбаўкі і павышэнні да іх, а таксама даплаты пенсіянерам, старэйшым за 75 гадоў. Што тычыцца ўсіх астатніх працоўных пенсій, то іх пераразлік плануецца да канца бягучага года ў межах сродкаў дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Што тычыцца другога пытання: з 2012 года да пенсій непрацуючых пенсіянераў, якія стаяць на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і якія дасягнулі ўзросту 75 гадоў і старэйшага, устаноўлена даплата. Яе памер складае для асоб ва ўзросце 75—79 гадоў 75% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце, для асоб ва ўзросце 80 гадоў і старэйшых — 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце. Названая даплата ўстанаўліваецца аўтаматычна з першага чысла месяца, наступнага за месяцам дасягнення ўзросту 75 або 80 гадоў. Яна выплачваецца штомесяц і пераразлічваецца ў сувязі з павелічэннем БПМ. Як адзначана вышэй, пераразлік названай даплаты быў зроблены ў жніўні.

Па пытанні змены памеру атрыманай вамі даплаты (з 75% на 100% мінімальнага памеру пенсіі па ўзросце) у сувязі з дасягненнем узросту 80 гадоў вам неабходна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Быхаўскага райвыканкама.

— Памерла сяброўка, пакінула дваіх дзяцей 18 і 20 гадоў. Хтосьці можа дапамагчы сіротам? (Яўгенія, па электроннай пошце.)

— Калі дзеці вашай памерлай сяброўкі вучацца ў Беларусі або за яе межамі (у адпаведнасці з міжнароднымі дамоўленасцямі) на дзённай форме атрымання адукацыі, то ім можа быць прызначана пенсія з нагоды страты карміцеля. Па гэтым пытанні, а таксама пытанні аказання матэрыяльнай дапамогі ім неабходна звярнуцца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне па месцы жыхарства.

— Вам тэлефануюць з Вілейкі, Юрый Пятровіч мяне завуць. І вось такое пытанне хачу задаць: як часта сацработнік павінен наведваць сваіх падапечных?

— Юрый Пятровіч, аказанне тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльных паслуг ажыццяўляецца на падставе дагавора аказання сацпаслуг. Дагавор складаецца індывідуальна з улікам патрэбы грамадзяніна ў сацыяльным абслугоўванні. У ім указваецца пералік сацыяльных паслуг, якімі грамадзянін пажадаў скарыстацца, а таксама перыядычнасць наведвання грамадзяніна сацыяльным работнікам, працягласць яго знаходжання, колькасць паслуг, што аказваюцца падчас аднаго візіту.

У выпадку платнага аказання тэрытарыяльным цэнтрам сацпаслуг кратнасць наведвання сацработніка залежыць ад пажаданняў грамадзяніна, замацаваных у дагаворы, у выпадку бязвыплатнага аказання сацыяльных паслуг — ад ступені абмежавання яго жыццядзейнасці. Напрыклад, грамадзяне, якія маюць умерана выяўленае абмежаванне жыццядзейнасці, абслугоўваюцца 2 разы на тыдзень, рэзка выяўленае абмежаванне — 4 разы на тыдзень.

— Мяне завуць Надзея Іванаўна, я з Маладзечна. У мяне цудоўны сацработнік! Як я магу падзякаваць гэтай добрай, душэўнай жанчыне? Калі я напішу падзяку, яе неяк адзначыць начальства?

— Зварот са словамі падзякі ў адрас свайго сацыяльнага работніка рэкамендуем накіраваць на адрас кіраўніка тэрытарыяльнага цэнтра, у якога маюцца паўнамоцтвы па прымяненні мер заахвочвання да работнікаў цэнтра.

— Дзякуй, так і зраблю!

— Я інвалід I групы (калясачніца), адзінокая. Якія віды сацыяльных паслуг маю права атрымаць у тэрытарыяльным цэнтры? (Пытанне прыйшло па электроннай пошце.)

— Тэрытарыяльныя цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва аказваюць сацыяльныя паслугі ў адпаведнасці з пералікам бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання з нормамі і нарматывамі забяспечанасці грамадзян гэтымі паслугамі, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 27 снежня 2012 г. № 1218 «Аб некаторых пытаннях аказання сацыяльных паслуг».

Непрацаздольным грамадзянам аказваюцца сацыяльна-бытавыя, сацыяльна-медыцынскія, сацыяльна-рэабілітацыйныя, сацыяльна-пасярэдніцкія паслугі, паслугі сядзелкі і іншыя віды сацыяльных паслуг, калі ў іх маецца патрэба. Напрыклад, у аддзяленнях дзённага знаходжання для інвалідаў і пажылых грамадзян арганізавана работа рэабілітацыйна-працоўных майстэрняў, розных гурткоў і клубаў па інтарэсах, камп'ютарных класаў. Сацыяльнымі работнікамі аддзяленняў сацыяльнай дапамогі на даму непрацаздольным грамадзянам прадастаўляецца шэраг сацыяльных паслуг з мэтай падтрымання іх самастойнай жыццядзейнасці ў побыце (паслугі па дастаўцы прадуктаў на дом, па прыборцы жылых памяшканняў і інш.).

Аказанне асобных сацыяльных паслуг залежыць ад стану здароўя чалавека (яго здольнасці ажыццяўляць самаабслугоўванне), якое пацвярджаецца даведкай, выдадзенай арганізацыяй аховы здароўя.

— Ірына Алегаўна Лаўрыновіч, г. Мінск (пытанне зададзена напярэдадні «прамой лініі»). Я актыўны чалавек. Неўзабаве планую выйсці на пенсію і мару паездзіць па свеце. Калі я здам кватэру і паеду ў падарожжа, скажам, на год, за мной захаваецца права на пенсію?

— Пенсія выплачваецца толькі ў перыяд пастаяннага пражывання (знаходжання) у Рэспубліцы Беларусь.

— Вас турбуе Паліна Іванаўна Мыцько, пражываю ў Лідскім раёне. Скажыце, калі ласка, калі я не знаходжуся на сацыяльным абслугоўванні, але мне трэба памыць акно, магу я звярнуцца ў ТЦСАН па дапамогу? Колькі гэта будзе каштаваць?

— Паліна Іванаўна, права на атрыманне сацыяльных паслуг, у тым ліку і разавай сацыяльна-бытавой паслугі па мыцці вокнаў, па сацыяльна нізкіх тарыфах маюць інваліды I і II групы, а таксама непрацуючыя грамадзяне, якія дасягнулі 60-гадовага ўзросту, якія маюць права на дзяржаўную пенсію і маюць патрэбу ў сацыяльным абслугоўванні (па заключэнні медыкаў).

У выпадку адсутнасці дакументальнага пацвярджэння аб патрэбе грамадзяніна ў сацыяльным абслугоўванні сацыяльная паслуга можа быць прадастаўлена яму ў рамках ажыццяўлення тэрытарыяльным цэнтрам пазабюджэтнай дзейнасці па эканамічна абгрунтаваным тарыфе. Кошт такой сацыяльнай паслугі разлічваецца, зыходзячы з нормы часу на яе аказанне і вызначанага гадзіннага тарыфу на сацыяльныя паслугі. Для таго каб даведацца канкрэтную суму, раю звярнуцца ў ТЦСАН па месцы вашага пражывання.

Святлана БУСЬКО, *busko@zviazda.by*

■ Клопат пра людзей

СТАРЭЕМ...

Краіны ўсяго свету думаюць над нацыянальнай палітыкай у дачыненні да пажылых

Нядаўна я перагледзела цудоўны фільм «Гатэль «Мэрыголд»: лепшы з экзатычных» — аб прыгодах англійскіх пенсіянераў у Індыі. Што цікава: гэтая зробленая ў лёгкай манеры брытанская камедыя на самай справе ўзняла актуальныя і вельмі нялёгкія тэмы, якія датычацца сучаснай старасці. Але давайце па парадку...

У фільме сем пажылых англічан (амаль усім ім далёка за 80) вырашылі правесці рэшту сваіх дзён у доме састарэлых у экзатычнай Індыі, дзе выдаткі на жыццё меншыя. Адна з гераінь пайшла на такі крок пасля таго, як ёй прыйшлося прадаць дом, каб аплаціць даўгі сына. Сужэнцы ўклалі ўсе свае грошы ў бізнес, але прайгралі і засталіся без капейкі. Яшчэ адной жанчыне неабходна аперацыя на сцягновым суставе, якая на радзіме каштуе велізарных грошай, а ў Індыі яна абыдзецца нашмат танней... Увогуле, у кожнага з герояў свае прычыны і свая гісторыя.

Усе гэтыя пенсіянеры спакусіліся рэкламай дома састарэлых, размешчанага ў гатэлі «Мэрыголд» у Індыі, але пасля прыбыцця на месца выявілася, што рэчаіснасць, як гэта і бывае, вельмі далёкая ад таго, што абяцала рэклама...

Калі чалавеку законам гарантавана бясплатная сацыяльная паслуга, ён яе атрымае, а працу індывідуальнага прадпрымальніка або некамерцыйнай арганізацыі, якія аказалі паслугу, аплаціць дзяржава.

У цэлым, нягледзячы ні на што, фільм атрымаўся маляўнічым (дзіва што, здымкі ж былі ў Індыі!) і лёгкім — дзякуючы мноству камічных сітуацый, у якія трапляюць яго героі. Але ж так і павінна быць у кіно, тым больш у камедыі. У жыцці, на жаль, закранутыя мімаходзь фільмам вельмі няпростыя пытанні і не самыя пазітыўныя з'явы, у першую чаргу такія, як адзінота і незапатрабаванасць старых, вырашыць значна складаней.

І, дарэчы, калі ўжо казаць пра сучаснае жыццё, то гэты фільм аказаўся жывой ілюстрацыяй сацыяльнай з'явы, якая ў апошні час набірае сілу ў Еўропе і якую спецыялісты называюць коратка і ёміста: «экспарт старых». Сутнасць яе ў тым, што пажылыя людзі з заходнееўрапейскіх краін, дзе вельмі дарагое жыццё, сталі пераязджаць жыць у дамы састарэлых у іншыя краіны, дзе цэны меншыя. Так, напрыклад, з Германіі яны ўсё часцей пераязджаюць жыць у Польшчу, а англійскія пенсіянеры накіроўваюцца ў Партугалію...

Па прагнозах ААН, да 2050 года кожны пяты чалавек у свеце будзе пенсіянерам. У Беларусі, якая адносіцца да ліку нацый, што старэюць, гэтая планка ўжо пройдзеная. Так, на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў маі гэтага года знаходзіліся 2 603,7 тысячы пенсіянераў, што складае 27,4% насельніцтва краіны.

Некаторыя эканамісты нават лічаць гэта шанцам для больш бедных краін: маўляў, калі тыя наладзяць у сябе якасныя паслугі для пажылых людзей, гэта можа стаць новай рухальнай сілай іх эканомікі.

***

На жаль, сучасныя рэаліі такія, што пажылыя людзі спадзяюцца на дзяржаўную падтрымку, але дзяржавам становіцца ўсё цяжэй спраўляцца са сваімі сацыяльнымі абавязкамі перад імі. У асноўным, напэўна, гэта адбываецца з-за аб'ектыўных прычын. Насельніцтва на нашай планеце жыве ўсё даўжэй, становіцца ўсё старэйшым. Бо доўгае жыццё — гэта і доўгая старасць. На першы погляд, гэтаму можна толькі радавацца, але, як аказалася, такая дэмаграфічная тэндэнцыя патрабуе шмат дадатковых выдаткаў. Эканамісты тут жа пачалі задавацца пытаннямі. Ні страхавыя кампаніі, ні пенсійныя фонды на Захадзе не гатовы траціць дадатковыя сродкі. Застаецца надзея толькі на дзяржаву. Але і дзяржавам у фінансавым сэнсе гэта аказалася цяжка.

Так, паводле прагнозаў, да 2050 года колькасць пажылых людзей, не здольных даглядаць сябе, у свеце павялічыцца ў чатыры разы. Многія з іх страцяць здольнасць да самастойнага жыцця праз абмежаваную мабільнасць, слабасць або іншыя фізічныя ці псіхічныя праблемы. Шмат каму спатрэбіцца якая-небудзь форма доўгатэрміновай дапамогі, уключаючы сястрынскае абслугоўванне дома, медыцынскія паслугі і дапамогу ў паўсядзённым жыцці, догляд у дамах састарэлых, доўгае лячэнне ў шпіталях.

Сёння ўрады ўсяго свету шукаюць выйсце з гэтай няпростай сітуацыі. І галоўным сваім памочнікам многія з іх бачаць прыватны бізнес, заахвочваючы яго прысутнасць у сацыяльнай сферы. Так, у Францыі і Італіі каля паловы стацыянарных паслуг для пажылых людзей аказваюць прыватныя кампаніі, а ў Германіі — і наогул амаль 90%. Дзяржавы бачаць у гэтым шлях да скарачэння выдаткаў і росту эфектыўнасці, бо падобная сістэма стварае канкурэнцыю на рынку паслуг. Пры гэтым сацыяльныя паслугі становяцца больш разнастайнымі, магчыма, і больш якаснымі і таннымі.

• Гэта цікава

КОЛЬКІ ГОД ПЕНСІІ

Першы еўрапейскі закон аб адказнасці дзяржавы перад пажылымі людзьмі быў прыняты ў Англіі ў 1601 годзе. Пенсійнае забеспячэнне ўпершыню было ўведзена для афіцэраў ваенна-марскога флоту ў Францыі ў 1673 годзе. У перыяд Вялікай французскай рэвалюцыі, у 1790 годзе, быў прыняты Закон аб пенсіях для грамадзянскіх дзяржаўных служачых, якія адслужылі трыццаць гадоў і дасягнулі пяцідзесяцігадовага ўзросту. Уласна пенсіі былі ўпершыню ўведзены ў 1880 годзе Бісмаркам у Германіі для людзей, старэйшых за 70 гадоў.

Больш за тое, у Еўропе ў апошні час усё большая стаўка робіцца на само грамадства — на валанцёраў і дабрачынныя арганізацыі. Там усё больш імкнуцца прыцягваць так званую нефармальную дапамогу, гэта значыць усё тых жа валанцёраў, у тым ліку ў якасці валанцёраў разглядаюць і людзей старэйшага пакалення, якія яшчэ поўныя сіл і энергіі.

***

Падобны падыход — уцягванне недзяржаўных арганізацый у сістэму аказання сацыяльных паслуг — у апошнія гады з'яўляецца трэндам і ў нашай краіне, а таксама ў суседняй Расіі.

У нас з 2013 года дзейнічае новая рэдакцыя закона «Аб сацыяльным абслугоўванні», якой прадугледжаны механізм прыцягнення юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў да аказання сацыяльных паслуг і рэалізацыі сацыяльных праектаў. Гэта называецца дзяржаўным сацыяльным заказам, дзякуючы яму некамерцыйныя арганізацыі могуць прэтэндаваць на субсідыі дзяржавы ў гэтай сферы.

Памер такіх субсідый вызначаецца мясцовымі органамі ўлады і можа дасягаць 50% кошту праекта. Сярод асноўных партнёраў дзяржавы на сёння — Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа. Гэтая арганізацыя мае вялікі вопыт аказання сацыяльных паслуг, кваліфікаваных сясцёр міласэрнасці, гатовых прыйсці на дапамогу тым людзям, якія па розных прычынах не атрымліваюць сацыяльных паслуг — гэта ляжачыя людзі, якія маюць хваробы з супрацьпаказаннямі для аказання паслуг тэрытарыяльным цэнтрам сацабслугоўвання насельніцтва.

Міністр працы і сацыяльнай абароны Беларусі Марыяна ШЧОТКІНА на «круглым стале» «Закон Рэспублікі Беларусь «Аб сацыяльным абслугоўванні»: правапрымяняльная практыка, праблемы і напрамкі ўдасканалення» асноўнай задачай назвала стварэнне канкурэнтнага рынку сацыяльных паслуг, каб чалавек мог сам выбраць арганізацыю, якая будзе прадастаўляць яму той ці іншы від абслугоўвання. З гэтай мэтай Міністэрства працы і сацыяльнай абароны падрыхтавала праект пастановы ўрада, накіраваны на ўдасканаленне механізму дзяржаўнага сацыяльнага заказу.

Пажылыя людзі з заходнееўрапейскіх краін, дзе вельмі дарагое жыццё, сталі пераязджаць жыць у дамы састарэлых у іншыя краіны, дзе цэны меншыя.

Пры гэтым не трэба думаць, што дзяржава перастане выконваць свае сацыяльныя абавязацельствы. Яна працягне гэта рабіць, але разлічвае на пашырэнне партнёрства з грамадствам і бізнесам у гэтым пытанні. І права грамадзян на платнасць або бясплатнасць сацыяльных паслуг таксама не аспрэчваецца. Калі чалавеку законам гарантавана бясплатная сацыяльная паслуга, ён яе атрымае, а працу індывідуальнага прадпрымальніка або некамерцыйнай арганізацыі, якія аказалі паслугу, аплаціць дзяржава.

Разам з тым, у адрозненне ад заходніх краін, нашы грамадскія арганізацыі і бізнес пакуль што не вельмі актыўна падключаюцца да аказання паслуг на ўмовах дзяржаўнага сацыяльнага заказу. І гэта праблема.

У Расіі тая ж сітуацыя, і яе цяпер імкнуцца памяняць. На Форуме рэгіёнаў, які прайшоў гэтым летам у Мінску, **першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Расійскай Федэрацыі Аляксей ВОЎЧАНКА** заявіў: «Мы спрабуем зразумець, якія яшчэ законы трэба змяніць, каб стварыць прыватнаму сектару больш спрыяльныя ўмовы для пранікнення ў гэтую сферу».

Святлана БУСЬКО, *busko@zviazda.by*

■ Фотафакт

Падарунак ад міліцыі

Супрацоўнікі міліцыі заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу грамадзянам. Напрыклад, нядаўна ў Дрыбіне яны ўстанавілі новую агароджу ветэрану вайны.

Міхаіл АКІНЧЫЦ з ветэранам Дзмітрыем ЗУХЦІКАВЫМ.

— Да нас звярнуўся інвалід Вялікай Айчыннай вайны Дзмітрый Ягоравіч Зухцікаў. Мы абмеркавалі яго просьбу на афіцэрскім сходзе і аднагалосна вырашылі дапамагчы. У наступны пасля звароту выхадны дзень завіталі да пенсіянера і хутка зрабілі сваю справу. Цяпер яго сядзібу агароджвае 30-метровы плот, — паведаміў **маёр Міхаіл АКІНЧЫЦ, намеснік начальніка Дрыбінскага РАУС**.

Сваякі ветэрана напісалі ў Дрыбінскі РАУС падзяку — за чуласць. Прыемна, што гэты выпадак не выключэнне. На рахунку дрыбінскіх міліцыянераў шмат добрых спраў.

Яны заўсёды клапоцяцца пра імідж сваёй прафесіі. Нядаўна на VI рэгіянальным фестывалі народнай творчасці, народных промыслаў і рамёстваў «Дрыбінскія таржкі» арганізавалі міні-выстаўку спецсродкаў. Усе ахвотныя мелі магчымасць прымераць на сябе бронекамізэльку, шлем і іншую амуніцыю.

Супрацоўнікі Дрыбінскага РАУС за працай.

Падлеткі і іх бацькі пыталіся пра службу ў міліцыі, удакладнялі, як паступіць ва ўстановы адукацыі МУС. Міхаіл Акінчыц асабіста інструктаваў кожнага, хто праяўляў цікавасць — а такіх аказалася каля 200 чалавек.

Нэлі ЗІГУЛЯ